**1 верасня 2022 г. – 140 гадоў з дня нараджэння СЯМЁНА ЮЛЬЯНАВІЧА СІДАРЧУКА (1882-1932), інжынера, архітэктара, аўтара праектаў будынкаў на сучаснай тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны**

Сямён Юльянавіч Сідарчук нарадзіўся 1 верасня 1882 года ў горадзе Кобрыне Гродзенскай губерні (цяпер г. Кобрын Брэсцкай вобласці). Яго бацькам быў кобрынскі мешчанін Юльян Герасімовіч Сідарчук, а маці - сялянка Марыя Качанка. Немаўля было хрышчонае ў Бяроза-Картузскай Свята-Петрапаўлаўскай царкве.



Першыя азы навукі Сямён асвоіў дома, а затым быў адпраўлены бацькамі на вучобу ў рэальнае вучылішча ў Беласток. Сярэднюю адукацыю юнак атрымаў у Віленскім рэальным вучылішчы, скончыўшы якое, паступае ў 1900 годзе ў Пецярбургскі інстытут грамадзянскіх інжынераў. Сямён старанна вучыўся, спасцігаючы акадэмічныя азы архітэктурнай творчасці яшчэ студэнтам. 28 мая 1907 года ён атрымлівае дыплом № 1714 грамадзянскага інжынера ў чыне X класа. 2 чэрвеня 1907 года за поспехі па прымяненні будаўнічай механікі ў будаўнічай практыцы ў час знаходжання ў інстытуце Сямён Сідарчук узнагароджаны саветам інстытута залатым медалём.

У студзені 1909 года малады архітэктар паступіў на службу ў Царскасельскае Палацавае ўпраўленне. Начальніку ўпраўлення генерал-маёру Ф. М. Пешкаву ён быў рэкамендаваны прафесарам інстытута В. Н. Сакалоўскім як «надзвычай працаздольны і таленавіты».

Гэта быў яркі і ўдалы пачатак архітэктурнай кар'еры С. Ю. Сідарчука пры двары расійскага імператара Мікалая II, у яго летняй рэзідэнцыі, які стаў выдатнай прафесійнай школай для маладога архітэктара. Спіс яго праектаў і выкананых па іх прац уражвае. Гэта і некалькі прыватных віл, і стрэльбішча для лейб-гвардыі гусарскага палка, дарогі і масты ў Царскасельскім павеце, праекты пашырэння палацавага (гарадскога) шпіталя і санаторыя для туберкулёзных дзяцей у Царскім Сяле, эксплуатацыйнае кіраванне і развіццё каналізацыі сеткі Царскага Сяла і станцыі біялагічнай ачысткі сцёкаў. Але галоўнымі яго праектамі варта прызнаць

Гасудараву ратную палату для музея гісторыі рускіх войн (пасля пачатку Першай сусветнай вайны - музея Вялікай вайны) і драўляную царкву на Брацкіх могілках загінуўшых у гады Першай сусветнай вайны ў гонар іконы Божай Маці «Утоли моя печали», збудаваную ў 1915 годзе па жаданні імператрыцы Аляксандры Фёдараўны (разабрана ў 1938 г.). Кажуць, што імператар Мікалай II называў яго «мой Сямён» і нават даручыў узвядзенне капліцы на магіле Грыгорыя Распуціна.

Незадоўга да рэвалюцыі Сямёна Сідарчука адправілі ў Варонеж праектаваць і будаваць завод выбуховых рэчываў. У 1918 годзе з прыходам да ўлады бальшавікоў С. Ю. Сідарчук з'ехаў у Кіеў, а ў 1919 годзе вярнуўся ў родны Кобрын. У выніку савецка-польскай вайны Заходняя Беларусь апынулася пад Польшчай, але таленавіты архітэктар не застаўся без працы.

Другі («польскі») перыяд творчасці С. Ю. Сідарчука, які доўжыўся на працягу 1920-1932 гадоў, быў не менш плённым. У 1920 годзе ён стаў намеснікам павятовага інжынера Кобрынскага павета. Служыў у дарожна-маставым аддзеле 4-й польскай арміі. Па яго праектах былі рэканструяваны гандлёвыя рады ў Кобрыне. Дзякуючы рэканструкцыі пачатку XX стагоддзя, гандлёвыя рады на вуліцы Інтэрнацыянальнай і ў раёне плошчы горада захавалі сваё гістарычнае аблічча. З’яўляўся аўтарам праектаў электрастанцыі, жылога квартала для дзяржаўных служачых у Кобрыне. З 1923 года да лістапада 1925 года працаваў старшым рэферэнтам Палескай акруговай Дырэкцыі грамадскіх работ. З 1925 па 1928 год - галоўны архітэктар горада Брэста. На пасадзе галоўнага архітэктара Брэста Сямён Юльянавіч

З 1925 года па 1928 год – галоўны архітэктар г. Брэста-над-Бугам (Брэста). На гэтай пасадзе Сямён Юльянавіч праявіў актыўную дзейнасць. Па яго праектах у горадзе былі рэканструяваны гандлёвыя рады, будынак казармы пад школу, трохпавярховы будынак яўрэйскай школы Талмуд-Тора, адбудаваны спаленыя масты ў Брэсцкай крэпасці і інш. У мястэчку Дамачава (Брэсцкі раён) пры Польшчы адна з вуліц насіла імя Сідарчука, паколькі ён рэгуляваў тут планіроўку вуліц. Аднак у гады савецкай улады назву змянілі, не ацаніўшы па заслугах справу і ўклад архітэктара ў культуру краіны.

У 1928 годзе С. Ю. Сідарчук пераехаў у горад Роўна

Валынскага ваяводства. Да 1930 года працаваў галоўным архітэктарам горада, а таксама займаўся прыватнай практыкай. Аўтар праекта «Валынскіх таргоў» (1930), дома ўкраінскай гімназіі імя М. Дубецкага, гарадской электрастанцыі, каналізацыі. Па яго праектах рэканструявана школа імя Сянкевіча, перабудаваны дом гарадскога ўпраўлення. У сярэдзіне 1930 года Сямён Юльянавіч становіцца галоўным архітэктарам Ковеля. Склаў праекты забудоў некалькіх кварталаў у Ковелі. У 1932 годзе прымаў удзел у конкурсе на галоўнага архітэктара Луцка.

Праекты Сямёна Юльянавіча на тэрыторыі Берасцейшчыны і Ровеншчыны сведчаць аб яго высокай прафесійнай дасведчанасці як у ландшафтнай архітэктуры і горадабудаўніцтве, так і ў тэндэнцыях сусветнай архітэктуры.

Узнагароджаны ордэнам Св. Станіслава III ступені (1911), ордэнам Св. Ганны III ступені (1915), ордэнам Св. Станіслава II ступені (1915).

Сямён Юльянавіч Сідарчук раптоўна памёр вясной 1932 года, пакінуўшы пасля сябе багатую архітэктурную спадчыну, якая стала цяпер здабыткам трох дзяржаў: Расіі, Беларусі і Украіны.

На жаль, асоба кобрынскага архітэктара С. Ю. Сідарчука была абыдзена ўвагай гісторыкаў і краязнаўцаў. Але яго імя пастулова вяртаецца ў гісторыю расійскай, украінскай і беларускай архітэктуры. Чым больш знаходзіцца інфармацыі пра асобу, тым мацней усведамленне, наколькі пладавітым быў наш таленавіты зямляк і наколькі шырокі геаграфічны дыяпазон яго творчасці.

На аснове даследчай працы «Імператарскі архітэктар Сідарчук С. Ю. Лёс і творчасць майстра» навучэнцаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 9 г. Кобрына» (кіраўнік: Казарына В. А., настаўнік гісторыі) распрацаваны віртуальны маршрут «Дарогамі маіх землякоў», які размешчаны на сайце Кобрынскай РЦБС.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Яны** нарадзіліся ў Кобрыне. [Сямён Юльянавіч Сідарчук] // Кобрын: мінулае і сучаснае. – Брэст, 2020. - С. 20 : фат.

**Михайлишин, О. Л.** Архітектор Семен Сидорчук: спроба творчого портрета забутого майстра / О. Л. Михайлишин // Вісник Національного університету водного господарства та природокористування. - Рівне, 2009. - Вип. 3 (47). - Ч. 3.

**Бензярук, А.** Месца жалобы і памяці / Анатоль Бензярук // Сельская праўда (Жабінка). – 2022. – 12 лютага.

Упамінаецца колішняя Жабінкаўская школа, узведзеная па праекце архітэктара Сямёна Юльянавіча Сідарчука.

**Бензярук, А.** Палескі дойлід Сідарчук / Анатоль Бензярук // Сельская праўда. — Жабінка, 2017. — 11 студзеня. — С. 3.

Пра кобрынскага архітэктара Сямёна Сідарчука.

**Глазов, В.** Архитектор Семен Сидорчук творил в Царском селе и Бресте-над-Бугом / Владимир Глазов // Брестский курьер. — 2013. — 14 марта (№ 11). — С. 20 : фот.

Биография С. Ю. Сидорчука, уроженца г. Кобрина; с 1925-1928 – гл. архитектора Бреста.

**Ильин, А.** Царский архитектор Семён Сидорчук / А. Ильин // Гістарычная брама : гісторыка-краязнаўчы часопіс. - 2011. - №1 (25).

**Введенский, Г.** Возродится ли Ратная палата? / Г. Введенский // Санкт-Петербургские ведомости. —2008. — 16 июня (№ 107).

**Мартынов, А**. Что в имени твоем, улица? / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 27 ліпеня.

**Имена** и времена [Изоматериал] : часть вторая / автор идеи: Николай Александров ; дизайн: Дмитрий Гронский. — Брест, 2015.

**Государственный** архив Брестской области (ГАБО). Ф.5. Оп.2. Д.609; Ф.1. Оп.11. Д.1851.

Кобрын
Сідарчук Сямён Юльянавіч
Архітэктары